## Даданыя сказы ўмовы. Умоўны перыяд

Даданыя сказы ўмовы далучаюцца злучнікамі si — *калі* (*б*), nisi — *калі* (*б*) *не* (адмаўляецца ўся ўмова), si non — *калі* (*б*) *не* (адмаўляецца асобнае слова). Разам з галоўным сказам даданы сказ умовы ўтварае ўмоўны перыяд.

Адрозніваюць наступныя віды ўмоўнага перыяду:

1) рэальны від (casus reālis). Умова і вынік уяўляюць сабой рэальнае дзенне. У галоўным і даданым сказах ужываюцца ўсе часы indicatīvus; у галоўным сказе таксама можа ўжывацца imperatīvus: Si ita putas (*praes. ind.*), erras (*praes. ind.*). — *Калі ты так думаеш*, *ты памыляешся*. Si non vis (*praes. ind.*) errāre, puta (*imperat. praes.*). — *Калі не хочаш памыляцца*, *думай*;

2) магчымы від (casus potentiālis). Умова адносіцца да будучага; вынік уяўляецца магчымым для выканання. У галоўным і даданым сказах ужываюцца praesens conjunctīvi для выражэння незакончанага трывання, perfectum conjunctīvi — для выражэння закончанага трывання: Si ita putes (*praes. conj.*), erres (*praes. conj.*). — *Калі б ты так думаў*, *ты б памыляўся* (= ты можаш так думаць). Si ita putavĕris (*perf. conj.*), erravĕris (*perf. conj.*). — *Калі б ты так падумаў*, *ты б памыліўся* (= ты можаш так падумаць);

3) нерэальны від (casus irreālis). Умова з’яўляецца невыканальнай, вынік немагчымы. У галоўным і даданым сказах ужываюцца imperfectum conjunctīvi, калі ўмова і вынік невыканальныя ў цяперашнім, і plusquamperfectum conjunctīvi, калі ўмова і вынік былі невыканальныя ў мінулым: Si ita putāres (*imperf. conj.*), errāres (*imperf. conj.*). — *Калі б ты так думаў*, *ты б памыляўся* (= але ты так не думаеш). Si ita putavisses (*pqperf. conj.*), erravisses (*pqperf. conj.*). — *Калі б ты так думаў*, *ты б памыляўся* (= але ты так не думаў);

4) змешаны від. Галоўны сказ адносіцца да аднаго віду ўмоўнага перыяду, даданы — да іншага: Si ita putes (*praes. conj.*; casus potentiālis), errābis (*fut. I ind.*; casus reālis). — *Калі б ты так думаў*, *ты будзеш памыляцца*.